Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Гродне затрымалі блогера Ціханоўскага і яго паплечнікаў. Спіс абнаўляецца дапоўнена

30.05.2020 **Тэгі**: пераслед, затрыманні



Сустрэча з Сяргеем Ціханоўскім у Гродне

Падчас перадвыбарчага пікету па зборы подпісаў за Святлану Ціханоўскую затрыманы кіраўнік яе ініцыятыўнай групы, блогер Сяргей Ціханоўскі. Таксама верагодна затрыманы людзі з каманды праекту "Краіна для жыцця".

Затрыманне адбылося каля 8 вечара. Спачатку да Ціханоўскага падышлі жанчыны і сталі задаваць яму правакацыцныя пытанні і чапаць яго за адзенне. Сяргей адыходзіў ад іх, але яны ўсё роўна даганялі яго. Затым падышлі два міліцыянты, і людзі сталі засланяць блогера ад іх. Затым раптоўна на зямлю ўпаў адзін з міліцыянтаў.



Скрыншот з відэатрансляцыі

Неўзабаве з'явіўся АМАП і затрымаў блогера.

Таксама дакладна разам з ім затрыманы аператар канала "Belarus12stop".

Анатоль Кудласевіч, які ездзіў па гарадах разам з блогерам, распавядае, што акрамя Ціханоўскага і аператара затрыманы яшчэ **Зміцер Фурманаў** - адміністратар тэлеграм-канала "Краіна для жыцця", удзельнік ініцыятыўнай групы Ціханоўскага.

Відавочца распавядае пра затрыманне Фурманава: *"Чатыры чалавекі ў цывільным падляцелі да яго ззаду, калі той сядзеў за сталом, схапілі за рукі і за ногі і пацягнулі ў сквер"*.



Абураныя людзі спрабавалі спыніць мікрааўтобусы сілавікоў. Затым яны пайшлі да РАУСа, куды верагодна павезлі затрыманых.



Людзі спрабуюць спыніць мікрааўтобус. Фота hrodna.life

Прыкладна ў **21.30** у РАУС актывісту **Мікалаю Саляніку** паведамілі, што затрымана агулам **10 чалавек**. У дадзены момант ідзе разбіральніцтва, а затрыманых развезлі па розных РАУСах горада. Салянік заклікае людзей разыходзіцца да пасля 22.00, каб не парушаць заканадаўства аб выбарах і не даваць падставы для зняцця Святланы Ціханоўскай з выбараў.

Ранкам наступнага дня, 30 траўня, каля будынку УУС аблвыканкаму быў затрыманы Мікалай Салянік. Салянік пайшоў туды, каб зноў паспрабаваць даведацца, дзе Ціханоўскі і астатнія затрыманыя. Актывісту сказалі, што супраць яго - Саляніка - вядзецца адміністрацыйная справа, а затым пасадзілі ў бус. Тэлефон актывіста недасяжны.

Як стала вядома "Радыё Свабода", Сяргей Ціханоўскі знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрыманьня Кастрычніцкага РАУС у Гродне. Таксама тут утрымліваюць Зміцера Фурманава, каардынатара штабу Святланы Ціханоўскай па Гарадзенскай вобласці.

Таксама "Свабода" паведамляе пра затрыманне Яўгена Разнічэнкі, удзельніка ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай. Ён быў затрыманы ўначы. Сувязь з ім знікла каля 1-й гадзіны ночы. Раніцай 30 траўня карэспандэнты "Свабоды" пабачылі, як Рэзнічэнку прывезлі ў РАУС Кастрычніцкага раёна Горадні ў міліцэйскай машыны.

Спіс затрыманых у Гродне 29 і 30 траўня:

- **Ціханоўскі Сяргей**
- **Фурманаў Зміцер**
- **Салянік Мікалай**
- **Разнічэнка Яўген**
- **Джыоеў Руслан**
- **Бакіноўскі Станіслаў** - яму стала дрэнна пасля затрымання, таму яго адвезлі ў кардыялагічны дыспансер. Па стане на 10.30 30 траўня ён знаходзіцца там у рэанімацыі. За ім сочыць міліцыя.
- **Аляксандр** - кіроўца з каманды Ціханоўскага (прозвішча высвятляецца)
- **Сяргей** - таксама з каманды Ціханоўскага (прозвішча высвятляецца)
- **Ушак Вергілій** - аператар з каманды Ціханоўскага. Сваякам адмаўляюцца казаць, дзе ён знаходзіцца.
- **Рудзянкоў Дзмітрый**
- **Лобасаў Мікалай**
- **Аляксей**
- яшчэ як мінімум 3 чалавекі

Таксама "Вясне" паведамілі пра тое, што каля 3 гадзін ночы быў затрыманы **Мікалай Лобасаў** з Мінска (прыехаў на маршрутцы ў Гродна) і **Аляксей** з Гомеля (кіроўца буса citroen).

Днём 30 траўня таксама быў затрыманы **Дмітрый Рудзянкоў**. Ён паехаў у цэнтр горада забіраць сваю машыну, якую напярададні пакінуў там падчас затрымання Ціханоўскага і яго паплечнікаў. Дзмітрый паведаміў "Вясне", што верагодна яго затрымаюць, бо на месцы, дзе стаіць машына, дзяжурыць АМАП. Дзмітрый паабяцаў выйсці на сувязь да 12.30, калі ён не будзе затрыманы. Але на сувязь ён не выйшаў.

Дапоўнена. 30 траўня каля 20 гадзін стала вядома, што на волю былі выпушчаны тры затрыманых. Гэта гомельцы Рудзянкоў Дзмітрый, **Аляксей Ісачанка** і мінчанін Мікалай Лобусаў. Іх апыталі ў якасці сведак.

Будзе дапаўняцца

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па санэстках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY